***С. А. Паўлава,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

# ГУМАНІСТЫЧНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ПАДЛЕТКАЎ

У Рэспубліцы Беларусь рэалізаваны шэраг праграм па падтрымцы дзяцей і моладзі, сярод якіх Прэзідэнцкая праграма «Дзеці Беларусі», рэспубліканская праграма «Моладзь Беларусі». У 2010 г. прынята Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг., у якой камп’ютарызацыя, падключэнне да сеткі Інтэрнэт, алічбоўка кніг, стварэнне электроннай бібліятэкі вызначаны асноўным інфармацыйным рэсурсам краіны. У праграмах, на жаль, ні слова няма аб чытанні, аб дакументнай камунікацыі [1]. Мадэрнізацыя бібліятэк павінна адбывацца, але ж не самае галоўнае – аснасціць бібліятэкі камп’ютарамі, развіццё інфармацыйных тэхналогій павінна разглядацца не як мэта, а як сродак, які дапамагае засвоіць інтэлектуальны і духоўны жыццёвы вопыт пакаленняў. Спроба абысціся без выхавання, падмяніць яго навучаннем і адукацыяй дзяцей, распачатая ў 1990-я гг., аказалася бесперспектыўнай.

Дэфармацыя ў духоўным жыцці грамадства немінуча адлюстравалася на ўзроўні чытацкага развіцця і культуры яго членаў. Дзеці і падлеткі, як і дарослыя, становяцца аб’ектам рынкавых адносін. А гэта, у сваю чаргу, фарміруе квазімастацкія патрэбы і ўстаноўкі. Даследаванні апошніх гадоў, праведзеныя Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, сведчаць аб тым, што вопыт выхавання пачуццяў, самасвядомасці і жыццятворчасці, увасоблены на старонках літаратурных твораў, абясцэньваецца прагматычнасцю чытання, збядненнем матывацыі, узрастаннем кампенсаторнай функцыі.

У структуры чытання дзяцей і падлеткаў у апошні час назіраецца змяненне суадносін «дзелавога» і «дасугавага» кампанентаў. Чытацкая дзейнасць у вачах дзяцей і падлеткаў усё часцей набывае ўтылітарнае адценне і не асэнсоўваецца як сфера асобаснага развіцця і самарэалізацыі. Узнікае відавочная супярэчнасць паміж псіхалагічнымі асаблівасцямі дзяцей і падлеткаў, абумоўленая станаўленнем асобаснай ідэнтычнасці, і няўменнем выкарыстаць для іх задавальнення патэнцыял мастацкай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У структуры вольнага часу дзяцей чытанне займае адно з апошніх месцаў. Эксперты падкрэсліваюць тэндэнцыю зніжэння цікавасці да чытання ў дзяцей і падлеткаў, тлумачаць гэта ў першую чаргу наяўнасцю мноства іншых крыніц інфармацыі, а таксама зніжэннем прэстыжу чытання [5, с. 70]. У сувязі з гэтым галоўнай місіяй дзіцячай бібліятэкі бачыцца развіццё гуманнасці ў чалавеку інфармацыйнага грамадства.

Гуманнасць з’яўляецца прызнаннем каштоўнасці чалавека, яго права на вольнае развіццё, праяўленне сваіх здольнасцей, сцвярджэння выгод чалавека як крытэрыя ацэнкі грамадскіх адносін. Бібліятэкі заўсёды былі ўвасабленнем ідэй гуманізму як асновы чалавечых адносін і грамадскай дзейнасці.

На думку расійскага навукоўцы А. В. Сакалова, «гэта адзіны свецкі сацыяльны інстытут, які мае права лічыцца сімвалам грамадскага гуманізму» [6, с. 29]. Але гуманнасць не нараджаецца сама па сабе: яна – вынік выхавання, фарміравання маральных асноў асобы, выпрацоўкі сістэмы каштоўнасцей і ідэалаў, імкнення да культурнага, сацыяльнага і духоўнага росту. Гуманістычная накіраванасць у выхаванні падрастаючага пакалення абгрунтавана ў канцэпцыі выхавання У. Т. Кабуша [2], у аснову якой пакладзена ўяўленне аб дзецях як аб самай вялікай каштоўнасці, а таксама ў працах беларускіх і расійскіх навукоўцаў – А. В. Сакалова, І. І. Ціхаміравай [7, с. 33]; В. В. Мартынавай [3], Е. В. Петушковай [4].

З гэтых пазіцый можна пераасэнсаваць сістэму бібліятэчнага абслугоўвання (рэсурсы, сродкі, формы, метады).

Дзіцячая бібліятэка з’яўляецца ўнікальным інстытутам, здольным прыцягнуць да чытання дзяцей і падлеткаў. Для гэтага яна мае адпаведныя рэсурсы, сродкі, формы і метады. Галоўным рэсурсам з’яўляецца мастацкая літаратура, якая, як вядома, прызнаны носьбіт духоўнай асновы чалавека, ідэалаў дабра, любові, спачування, гуманнасці. Мастацкая літаратура ўздзейнічае на чытача праз уяўленні і суперажыванні.

Сіла і поспех гэтага ўплыву мастацкай літаратуры вызначаецца эстэтычнымі каштоўнасцямі твора, узроўнем працэсу ўспрымання, стасункаў чытача з кнігай. Паўнацэннае ўспрыманне літаратуры немагчыма без чыста эмацыянальнага, непасрэднага «ўжывання» ў мастацкі вобраз. Аднак гэта толькі адзін бок паўнацэннага ўспрымання літаратурнага твора. На яго аснове адбываецца асэнсаванне чытаемага, суаднясенне прачытанага з жыццём. Паўнацэннае эстэтычнае ўспрыманне характарызуецца адзінствам

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКИ

эмацыянальнага і інтэлектуальнага, узнікненнем думак і пачуццяў у іх цэласна-духоўным адзінстве.

Фарміраванне культуры ўспрымання дзецьмі мастацкага твора – праблема гуманістычнай педагогікі. У бібліятэчным абслугоўванні назапашаны багаты арсенал сродкаў, форм, метадаў фарміравання культуры чытання. Бібліятэкары, на жаль, недастаткова іх выкарыстоўваюць. Аўтар канцэпцыі гуманістычнага выхавання У. Т. Кабуш засяроджвае ўвагу на такіх сродках, як дзейнасць, стасункі і адносіны [4]. У бібліятэцы ініцыятыва ў стасунках і ў фарміраванні гуманістычных адносін ідзе ад бібліятэчнага супрацоўніцтва, для якога характэрна вера ў індывідуальнасць дзіцяці, неабмежаваныя яго магчымасці.

У. Т. Кабуш падкрэслівае, што ў гуманістычнай сістэме выхавання стасункі маюць першачарговае значэнне. Пры дапамозе стасункаў чытачамі засвойваюцца маральныя і сацыяльныя нормы паводзін, агульначалавечыя духоўныя каштоўнасці, адбываецца самасцвярджэнне і самарэалізацыя дзіцяці, інтэграцыя набытых ведаў, прывядзенне іх у пэўную сістэму. Сітуацыя стасункаў узнікае часцей за ўсё пры выбары чытачом кнігі і пры вяртанні яе ў бібліятэку. Мэта гутаркі-рэкамендацыі – зацікавіць чытача, а гутаркі аб прачытанай кнізе – падзяліцца ўражаннем. Гэта дзве часткі адзінага педагагічнага працэсу, магчымасць для роздуму, меркаванняў, разважанняў. Стасункі будуюцца на ідэях гуманістычнага выхавання, на прынцыпах дыялогу, раўнапраўных суб’ект-суб’ектных адносін.

Гуманістычная накіраванасць бібліятэчнага абслугоўвання праяўляецца ў арганізацыі групавых стасункаў. Формы такіх мерапрыемстваў могуць быць самымі разнастайнымі.

Гуманістычнай педагогікай рэкамендуецца выкарыстоўваць такія формы і метады, як дыскусія, драматызацыя, дыялогіка. У ходзе дыскусіі адбываецца выпрацоўка ўласнага меркавання падлеткаў, разуменне іншых поглядаў і пазіцый.

Гэта далёка не поўныя і не вычарпальныя магчымасці бібліятэкі ў гуманістычным выхаванні падлеткаў, але відавочна, што ў рашэнні адпаведных праблем сродкамі мастацкай літаратуры можна вызначыць шэраг звязаных паміж сабой педагагічных задач і дзеянняў. Пералічым некаторыя з іх, якія маюць дачыненне да бібліятэчнай работы з дзецьмі:

– адбіраць творы дзіцячай мастацкай класікі з улікам узроставых патрэбнасцей дзяцей і іх жыццёвага вопыту;

– вызначаць у адабраных творах тыя сітуацыі, з якімі, або падобнымі да іх, можа сустрэцца або ўжо сустракаўся падлетак у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэальным жыцці. Выявіць выхаваўчы патэнцыял гэтых сітуацый. Прадумаць, якія законы духоўнага жыцця сканцэнтраваны ў іх. Вызначыць тэматычны ракурс, найбольш значны і актуальны для цяперашніх дзяцей, скрозь прызму якога і будуць разглядацца выбраныя сітуацыі;

– далучаць чытача шляхам прадуманых пытанняў да жыццёвых сітуацый, адлюстраваных у кнізе. Пры гэтым апірацца неабходна на асабістыя адносіны да праблем, якімі занепакоены героі твора;

– прапанаваць чытачу выказаць свае адносіны да сітуацыі і прывесці па магчымасці аналагічныя прыклады з жыцця і мастацтва;

– заахвоціць чытача з дапамогай пытанняў выказаць свае меркаванні (чаму здарылася сітуацыя? чаму кожны герой паводзіў сябе менавіта так, а не інакш? ці аднолькавымі матывамі яны кіраваліся? як гэта адбілася або магло адбіцца на іншых людзях?);

– прайграць у думках ў выглядзе ролевай гульні сітуацыю з тым, каб чытач змог уявіць сябе на месцы персанажаў і ўдзельнічаць з іх пазіцыі;

– пачынаць гэту работу з самага ранняга дзяцінства, калі дзіця найбольш актыўна ўспрымае і засвойвае маральны вопыт;

– вучыць мове мастацтва; выхоўваць густ да сапраўднай літаратуры; фарміраваць імунітэт да нізкапробных кніг.

Прапанаваная сістэма кіраўніцтва чытаннем, на наш погляд, дапаможа бібліятэкарам знайсці сваё месца ў сістэме фарміравання гуманістычных каштоўнасцей падлеткаў.

Няжорстскасць бібліятэчнага ўплыву, камфортнасць умоў, магчымасці эмацыянальнага кантакту з бібліятэкарам і міжасобасных стасункаў дазваляюць прапанаваць чытачам-дзецям індывідуальна прымальныя шляхі выхавання на аснове чытання мастацкай літаратуры.

---


1. *Дзяржаўная* праграма «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады : пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 26 снеж. 2010 г., № 1905 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2010. – № 5/33092.

2. *Кабуш, В. Т.* Гуманистическое воспитание: концепция / В. Т. Кабуш ; Министерство образования Респ. Беларусь ; Академия последипломного образования. – Минск, 1998. – 97 с.

3. *Мартынова, В. В.* Гармония любви – к себе, другим людям и миру / В. В. Мартынова // Праблемы выхавання. – 1997.– Вып. 6. – С. 43–49.

4. *Петушкова, Е. В.* Целевая направленность и ценностные ориентиры гуманистического воспитания / Е. В. Петушкова // Праблемы выхавання. – 1997. – Вып. 6. – С. 10–18.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Современное* состояние и тенденции развития детского чтения в Республике Беларусь : по результатам республиканского исследования // Национальная библиотека Беларуси ; сост.: Н. Б. Пшибытко, О. В. Гаврилович. – Минск, 2011. – С. 70.
6. *Соколов, А. В.* Гуманистический символ нации / А. В. Соколов // Библиотечное дело. – 2011. – № 7. – С. 29.
7. *Тихомирова, И. И.* Надежда на ренессанс / И. И. Тихомирова // Библиотечное дело. – 2011. – № 7. – С. 31–33.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ